Падтрымай "Вясну" на PATREON

Суд аштрафаваў Алену Луцковіч за публічную заяву пра фальшаваньне выбараў

05.11.2015 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, выбары-2015



Алена Луцковіч у судзе

4 лістапада судзьдзя Акцябрскага раённага суду Ўладзімер Васілеўскі аштрафаваў на 2 мільёны 700 тысяч рублёў лідэра «Маладых дэмакратаў» Аб'яднанай грамадзянскай партыі, назіральнацу на выбарах Алену Луцковіч — за правядзеньне несанкцыянаванага адзіночнага пікету з плякатам «У мяне ёсьць доказы, што выбары сфальшаваны!»

«Вельмі сумна, на самай справе. Сваім пікетам я спрабавала прыцягнуць увагу да фальшаваньня выбараў. Адбылося злачынства, і я спрабавала дамагчыся расьсьледаваньня гэтага злачынства, праверкі на гэты конт, каб вінаватых пакаралі. Замест гэтага пакаралі мяне, зрабілі нейкага злачынцу ці злосную хуліганку, якая парушае грамадзкі парадак. Пятнаццаць базавых — гэта вялікі штраф для мяне. Сумна ад таго, як працуюць нашы органы ўнутраных спраў, якая ў нас у краіне судовая сыстэма. Сумна ад таго, як адрэагавала пракуратура на маю заяву пра фальшаваньне. Надзея, канечне, памірае апошняй, і яна яшчэ ў мяне застаецца. Я чакаю адказу ад Сьледчага камітэту, куды я зьвярталася з заявай пра фальшаваньне вынікаў выбараў», — сказала адразу пасьля суду **Алена Луцковіч**.

30 кастрычніка спадарыня Луцковіч выйшла на тэрыторыю мясцовага рынку з плякатам «У мяне ёсьць доказы, што выбары сфальшаваны!» Гэта адбылося пасьля таго, як з пракуратуры ёй прыйшла адмова на скаргу пра неадпаведнасьць вынікаў выбараў. У актывісткі ёсць доказы фальшаваньня, зь якімі яна й грамадзкі актывіст **Андрэй Павук** зьвярталіся ў пракуратуры ўсіх узроўняў — ад раённай да генэральнай. Але пракуратуру доказы парушэньня закону не зацікавілі. І раённая, і генпракуратура адпісаліся, што прайшлі тэрміны абскарджваньня вынікаў выбараў, таму «звароты пакінуты без разгляду па сутнасьці».

Міліцыя затрымала былую назіральніцу. Начальнік аддзелу аховы грамадзкага парадку й прафіляктыкі правапарушэньняў РАУС **Уладзімер Гапоненка** склаў супраць актывісткі адміністрацыйны пратакол за несанкцыянаваны пікет, на падставе якога былую назіральніцу і пакаралі буйным штрафам.

"Гомельская Вясна"

Твитнуть







зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

СЯБРОЎСТВА

EENEMO





















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY